# СІЛА Ў ЯДНАННІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Карыстаючыся выпадкам, Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з гэтай падзеяй прэм'ер-міністра Індыі Нарэндра Модзі і прэм'ер-міністра Пакістана Наваза Шарыфа.

## Бяспека — непадзельная

Прэзідэнт запэўніў, што Беларусь, знаходзячыся на «заходнім рубяжы» ШАС, як донар рэгіянальнай стабільнасці гатова на справе ўносіць свой канкрэтны ўклад у дасягненне мэтаў арганізацыі зыходзячы з неабходнасці ўсеагульнай і непадзельнай бяспекі.

«Лічу, што ў спалучэнні з намаганнямі «шанхайскай сям'і» захоўвае сваю актуальнасць беларуская ініцыятыва аб наладжванні новага маштабнага дыялогу паміж Усходам і Захадам, аналагічнага Хельсінкскаму працэсу. Шанхайскую арганізацыю сёння немагчыма праігнараваць ні ў адным з пытанняў парадку дня сусветнага развіцця. Маючы негатыўны вопыт падзелу і войнаў, наша краіна адначасова служыць пазітыўным прыкладам мірнага суіснавання культур і рэлігій», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## Умацаванне эканамічнага вымярэння

Кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў, што сацыяльная нестабільнасць, якая расце ў асобных краінах і рэгіёнах, цесна звязана з узроўнем іх развіцця. «Прычына нестабільнасці менавіта ў гэтым. Скажу шчыра: сёння Еўропа пакутуе ад наплыву бежанцаў, дык вось, калі б Еўропа не адгароджвалася і не дэстабілізавала гэты рэгіён, а дапамагла, то сёння не мела б гэтай праблемы. Заява Сі Цзіньпіна аб тым, што Кітай будзе садзейнічаць развіццю дзяржаў не толькі ШАС, але і па перыметры арганізацыі, якраз вельмі важная з пункту гледжання вырашэння гэтай страшнай праблемы нелегальнай міграцыі, якая вядзе да глабальнага тэрарызму. Перакананы, што ўмацаванне эканамічнага вымярэння ШАС будзе садзейнічаць вырашэнню гэтага няпростага пытання», — сказаў Прэзідэнт. Ён прапанаваў падумаць над распрацоўкай канкрэтных праектаў (эканамічных, інвестыцыйных, лагістычных, гуманітарных), у тым ліку з актыўным прыцягненнем дзяржаў-назіральнікаў.

«Мы падтрымліваем ініцыятыву аб неабходнасці гарантавання харчовай бяспекі на кантыненце. Праблема нарастае. З'яўляючыся буйным вытворцам харчовай прадукцыі, Беларусь паслядоўна выступае за зняцце штучных бар'ераў у гэтай сферы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка назваў сімвалічным той факт, што саміт у Астане па часе фактычна супадае з пачаткам работы міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «ЭКСПА-2017», якая прысвечана энергіі будучыні. «Гэты сусветны агляд дасягненняў дазволіць пашырыць эканамічную кааперацыю членаў ШАС і іх партнёраў», — упэўнены ён.

## Сувязнае звяно паміж Еўропай і Азіяй

Прэзідэнт заявіў, што ў Беларусі надаюць вялікае значэнне вырашэнню задач па ліквідацыі перашкод на шляху руху тавараў, паслуг, капіталаў і рабочай сілы ў Еўразіі.

«Вырашыўшы гэтую праблему, мы зробім так, што свет наогул перастане пра яе гаварыць», — падкрэсліў беларускі лідар. «Сённяшняя сустрэча, па сутнасці, з'яўляецца працягам на новым узроўні шматвектарнага дыялогу, які вялі ў Пекіне ў рамках міжнароднага форуму «Адзін пояс і адзін шлях». Гэта адзін з глабальных прыкладаў, у такім кірунку павінна развівацца наша арганізацыя, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Бяспрэчна, гэта наймагутнейшы стымул для развіцця не толькі ШАС, але і Еўразіі, усяго свету. Форум прадэманстраваў зацікаўленасць большасці краін свету ў рэалізацыі такога беспрэцэдэнтнага па маштабе праекта».

«Мы гатовыя ўзмацняць ролю Беларусі як сувязнага звяна паміж Еўропай і Азіяй і прапануем партнёрам больш актыўна выкарыстоўваць гэты патэнцыял», — адзначыў беларускі лідар.

* * *

Прэзідэнт таксама правёў перагаворы з замежнымі лідарамі ў кулуарах саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Кіраўнік дзяржавы прадуктыўна і прадметна пагутарыў з прэм'ер-міністрам Індыі Нарэндра Модзі, які запрасіў Прэзідэнта наведаць гэтую краіну восенню. Грунтоўная размова на палях форуму адбылася з прэм'ер-міністрам Пакістана Навазам Шарыфам напярэдадні яго візіту ў Беларусь. Адбыліся таксама сустрэчы з кіраўнікамі Расіі, КНР, Афганістана і Таджыкістана. Зацікаўленасць у візіце Аляксандра Лукашэнкі для выпрацоўкі новага парадку дня ва ўзаемадзеянні дзвюх краін выказаў падчас перагавораў і міністр замежных спраў Ірана. Раней Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з генеральным сакратаром ААН Антоніу Гутэрышам.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ НАПРАЦОЎВАЮЦЬ КАНТАКТЫ

**Парламентарыі робяць істотны ўнёсак у развіццё дыпламатычных кантактаў нашай краіны, а таксама ў наладжванне дзелавых сувязяў паміж нашымі рэгіёнамі, прадпрыемствамі і замежнымі партнёрамі. Падчас сустрэчы намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Баляслава ПІРШТУКА з дэпутатамі Нацыянальнай асамблеі Эквадора размова ішла як пра развіццё міжпарламенцкіх сувязяў, так і пра іншыя кірункі супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў.**

### ПАТЭНЦЫЯЛ ДЛЯ ТАВАРААБАРОТУ

Апошнім часам беларуска-эквадорскія адносіны развіваюцца даволі імкліва. Пасля таго як у 2012 годзе кіраўнік нашай краіны Аляксандр Лукашэнка наведаў Эквадор з афіцыйным візітам, дзяржавы абмяняліся пасольствамі, запрацавала Беларуска-эквадорская камісія па гандлі і эканамічным развіцці.

— У нас адбылася дастаткова вялікая колькасць узаемных візітаў, — канстатаваў віцэ-спікер ніжняй палаты. — Закладзена добрая, на маю думку, база ў нашых адносінах: як на ўзроўні лідараў краін, так і на ўзроўні парламентаў, урадаў.

Баляслаў Пірштук выказаў спадзяванні, што ў хуткім часе будуць ратыфікаваны гандлёва-эканамічныя пагадненні па выключэнні дзвайнога падаткаабкладання. Акрамя гэтага, у канцы мая Беларусь і Эквадор падпісалі пагадненне аб прызнанні дакументаў аб адукацыі і дыпломаў аб вышэйшай адукацыі.

Што да міжпарламенцкіх адносін, то заканадаўцы абедзвюх краін трымаюць добры кантакт. Так, Эквадор падтрымаў Беларусь, і цяпер мы маем статус назіральніка ў Лацінаамерыканскім парламенце. У той жа час і папрацаваць ёсць над чым:

— Вельмі разлічваю, што больш актыўна будуць працаваць нашы парламенцкія рабочыя групы. Спадзяюся, што мы зможам у нашы адносіны прыўнесці добрыя канкрэтныя кантакты і адпаведна добрыя мерапрыемствы. Тавараабарот, які мы маем паміж нашымі краінамі, дастаткова сціплы. У нас ёсць шмат таварных груп, якія б мы маглі пастаўляць вам, вы маглі б пастаўляць тавары ў нашым кірунку ў Рэспубліку Беларусь. Мы маглі б у разы павялічыць нашы лічбы, — упэўнены Баляслаў Пірштук.

### БЯЗВІЗАВЫ РЭЖЫМ У ДАПАМОГУ

Падчас сустрэчы Баляслава Пірштука з **намеснікам галоўнага ўпраўляючага Нямецкага саюза прамыслова-гандлёвых палат Фолькерам ТРАЕРАМ** абмяркоўваліся ў першую чаргу пытанні далейшага ўзаемадзеяння.

Віцэ-спікер ніжняй палаты падкрэсліў: адносіны Беларусі і Германіі падтрымліваюцца на дастаткова прыстойным узроўні.

— Мы вельмі шмат запазычваем у Германіі ў тым, што датычыцца тэхналогій, падыходаў, — звярнуў увагу Баляслаў Пірштук. — Нам пашанцавала мець партнёра, які мае такія добрыя параметры ў эканоміцы: Германія — лепшая эканоміка Еўропы. Мы настроены на канструктыўную працу. У нас дастаткова шмат пытанняў: і вялікіх, і малых, якія нам неабходна пераадолець і вырашыць у найбліжэйшы час.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Беларусі Петэр Дэтмар станоўча ацаніў пяцідзённы бязвізавы рэжым, які ўвяла наша дзяржава для грамадзян 80 краін. Па яго словах, нямецкі бізнес зацікаўлены ў пашырэнні кантактаў з Беларуссю. Фолькер Траер звярнуў увагу, што кантакты паміж краінамі наладжаны добрыя, ёсць магчымасць своечасова інфармаваць партнёраў пра патэнцыял супрацоўніцтва.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# КРАІНА ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ІНВЕСТЫЦЫЯХ З ІЗРАІЛЯ

**Нашу дзяржаву і Ізраіль звязвае вельмі многае. Прынамсі, у Беларусі яўрэі пражывалі многія стагоддзі. Родам з нашай краіны — цэлы шэраг вядомых грамадскіх, палітычных дзеячаў Дзяржавы Ізраіль. А зусім нядаўна — 26 мая — краіны адзначылі 25-годдзе са дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін. З гэтай сапраўды святочнай датай амаль супаў візіт у нашу дзяржаву віцэ-спікера Кнэсэта (парламент Ізраіля) Талі ПЛОСКАЎ.**

— Мы ведаем вас як чалавека, які вельмі актыўна працуе над развіццём двухбаковых адносін паміж Ізраілем і Рэспублікай Беларусь. Ёсць канкрэтныя вынікі, ваш асабісты ўнёсак. Вы прыклалі добрыя намаганні ў пытанні захавання пасольства Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь. Думаю, гэта вельмі добры пачатак і ў вашай парламенцкай дзейнасці, — заявіў **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

Трэба сказаць, што Талі Плоскаў узначальвае парламенцкую групу сяброўства Ізраіль — Беларусь. У нашым парламенце адпаведную групу ўзначальвае Аляксандр Папкоў, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, які таксама прыняў удзел у сустрэчы. Паміж заканадаўчымі органамі наладжаны добрыя кантакты, так, Аляксандр Папкоў быў з візітам у Ізраілі.

Спікер ніжняй палаты звярнуў увагу на шэраг перспектыўных кірункаў двухбаковага супрацоўніцтва, асаблівую ўвагу ён удзяліў інвестыцыям. З ізраільскім капіталам у нашай краіне рэалізуецца больш за 150 праектаў.

* * *

У той жа дзень **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу,** таксама правёў сустрэчу з гасцямі з Ізраіля. Падчас яе спікер верхняй палаты закрануў разнапланавыя сферы супрацоўніцтва дзвюх краін: інвестыцыі, фармацэўтыка, мікраэлектроніка, турызм і міжпарламенцкае супрацоўніцтва. «Мы хацелі б стварыць міжнародны фінансавы цэнтр. Гэта магло б быць вельмі актуальна. Калі б вы нам дапамаглі з рэалізацыяй гэтага праекта, мы былі б рады сумеснай працы», — прапанаваў спікер верхняй палаты беларускага парламента.

**Надзея ЮШКЕВІЧ,**
*yushkevich@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*ustavit@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

# САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА — ПРЫКЛАД ДЛЯ ЎСЯГО СВЕТУ



**На думку Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расіі ў Беларусі Аляксандра СУРЫКАВА, у многіх напрамках узаемадзеянне народаў Беларусі і Расіі ў Саюзнай дзяржаве яшчэ доўга будзе прыкладам для ўсіх інтэграцыйных утварэнняў былых рэспублік СССР і іншых міжнародных фарміраванняў. Падчас прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да Дня Расіі, ён таксама падкрэсліў, што захаванне Саюзнай дзяржавы неабходна нават пры ўмове, што абедзве краіны з'яўляюцца членамі ЕАЭС.**

«Вопыт Саюзнай дзяржавы дапамог запусціць праект ЕАЭС. Далейшая актывізацыя расійска-беларускага ўзаемадзеяння і паскарэнне ўзаемавыгадных інтэграцыйных працэсаў адпавядаюць карэнным інтарэсам дзвюх краін. Пры гэтым, магчыма, спатрэбіцца актуалізаваць іх нейкім дагаворам у Саюзнай дзяржаве з улікам пераходу эканомікі ў большай ступені ў ЕАЭС», — лічыць Аляксандр Сурыкаў.

Ён таксама пракаментаваў спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць пры пастаўках харчовай прадукцыі Беларусі ў Расію. «Так, сапраўды ёсць пытанні, якія звязаны са зменамі заканадаўства ў сувязі са стварэннем ЕАЭС і прыняццем рэгламентаў. Шмат спрэчак аб рэштkавых леках у малочнай прадукцыі. Я думаю, што ў хуткім часе яны ўрэгулююцца рашэннем Еўрапейскай эканамічнай камісіі. Яна можа пашырыць спіс лекаў або прымяніць яго па дамоўленасці паміж дзвюма краінамі», — растлумачыў Аляксандр Сурыкаў.

Ён дадаў, што аналагічныя спрэчкі ўзнікаюць цыклічна з-за коштаў на энерганосьбіты. На думку пасла, яны знікнуць са стварэннем адзінага рынку газу да 2025 года. Расійскі бок таксама паспрабуе ў двухбаковым фармаце стварыць яго раней.

Акрамя таго, дзве краіны да канца гэтага года вызначацца па шасці інтэграцыйных праектах. «Пачалася праца нашых мінпрамаў, а трэба было б яшчэ мінсельгасам папрацаваць. Пакуль ідзе праца, якая збліжае паняцці», — адзначыў Аляксандр Сурыкаў. Беларусь разглядае рэалізацыю праектаў у галіне машынабудавання і нафтахіміі, Расія — у АПК і іншых сферах. «Думаю, што мы да канца года вызначымся, якія гэта праекты, што гэта такое. Відавочна, што інтэграваць эканомікі трэба глыбей, калі мы хочам устойлівага развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза. Да канца года мы будзем мець карціну па праектах», — рэзюмаваў пасол. Як паведамлялася, Беларусь і Расія дамовіліся прапанаваць адна адной па тры інтэграцыйныя праекты. Формы супрацоўніцтва па іх могуць быць рознымі — гэта і абмен актывамі, і купля пэўнага пакета акцый.

***

Аляксандр Сурыкаў паведаміў, што ўезд для грамадзян Беларусі ў расійскіх аэрапортах плануецца палегчыць. Пасля таго як самалёты з Беларусі перавялі ў міжнародныя тэрміналы расійскіх аэрапортаў, пасажыры праходзяць памежны кантроль. У далейшым для беларусаў кантроль паспрабуюць спрасціць, каб не было нават неабходнасці сканаваць пашпарт.

Таксама пасол адзначыў, што ёсць пытанне па чартарных рэйсах — грамадзяне Беларусі лятаюць на працу ў Заходнюю Сібір чартарам, і цяпер вядзецца дыялог паміж пагранслужбамі, каб зрабіць гэты працэс па паведамляльнай прыкмеце. Мяркуецца, што створаць спіс, які будзе перадавацца расійскай пагранслужбе, і людзі па прыбыцці не будуць праходзіць ніякіх працэдур.

Паралельна вядзецца работа, якая палегчыць доступ замежным грамадзянам з Расіі ў Беларусь. «Мы хочам спрасціць гэты працэс шляхам узаемнага прызнання віз: калі віза выдадзена расійскімі ўстановамі замежнаму грамадзяніну, то на тэрыторыі Беларусі ён праходзіць хутчэй і наадварот», — растлумачыў Аляксандр Сурыкаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*


# РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о повторном открытом аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления**

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, рос. руб. | Задаток, рос. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Апартамент №001 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь –101,2 кв. м | 12 710 276,00 | 1 271 027,60 |
| Лот №2 | Апартамент №002 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 59,7 кв. м | 7 977 119,00 | 797 711,90 |
| Лот №3 | Апартамент №003 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 61,2 кв. м | 8 177 011,00 | 817 701,10 |
| Лот №4 | Апартамент №004 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1619 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 99,6 кв. м | 14 429 347,00 | 1 442 934,70 |
| Лот №5 | Апартамент №101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №1. Площадь – 101,7 кв. м | 13 785 409,00 | 1 378 540,90 |
| Лот №6 | Апартамент №104 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №1. Площадь – 100,8 кв. м | 13 664 046,00 | 1 366 404,60 |
| Лот №7 | Апартамент №201 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1528. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №8 | Апартамент №202 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 170,9 кв. м | 22 739 143,00 | 2 273 914,30 |
| Лот №9 | Апартамент №203 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1546. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 103,1 кв. м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот №10 | Апартамент №204 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1547. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 69,4 кв. м | 10 752 762,00 | 1 075 276,20 |
| Лот №11 | Апартамент №205 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1530. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 116,7 кв. м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот №12 | Апартамент №206 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1531. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 98,7 кв. м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот №13 | Апартамент №208 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1533. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №14 | Апартамент №209 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1534 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 60,6 кв. м | 10 135 952,00 | 1 013 595,20 |
| Лот №15 | Апартамент №210 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №16 | Апартамент №211 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь –123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №17 | Апартамент №301 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1630. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №18 | Апартамент №302 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1636. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №19 | Апартамент №303 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1634. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 103,1 кв. м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот №20 | Апартамент №305 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв. м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот №21 | Апартамент №306 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв. м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот №22 | Апартамент №308 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №23 | Апартамент №309 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №24 | Апартамент №310 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1538. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №25 | Апартамент №311 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1541. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №26 | Апартамент №401 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1540. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №27 | Апартамент №402 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1536. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №28 | Апартамент №403 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1537. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №29 | Апартамент №404 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв. м | 11 108 284,00 | 1 110 828,40 |
| Лот №30 | Апартамент №405 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1550. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 116,7 кв. м | 18 457 171,00 | 1 845 717, 10 |
| Лот №31 | Апартамент №408 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1568. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №32 | Апартамент №409 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1569. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №33 | Апартамент №410 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №34 | Апартамент №411 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1572. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №35 | Апартамент №501 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1564. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №36 | Апартамент №502 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1565. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №37 | Апартамент №503 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №38 | Апартамент №505 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1593. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 116,7 кв. м | 18 457 171,00 | 1 845 171,10 |
| Лот №40 | Апартамент №509 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1553. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №41 | Апартамент №510 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1567. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №42 | Апартамент №511 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1571. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №43 | Апартамент №601 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1573. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №44 | Апартамент №602 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1576. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №45 | Апартамент №608 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1557. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №46 | Апартамент №609 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1587. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №47 | Апартамент №610 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1558. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №48 | Апартамент №611 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1594. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №49 | Апартамент №701 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1595. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207, 60 |
| Лот №50 | Апартамент №702 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1583. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №51 | Апартамент №703 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1566. Назначение – нежилое. Этаж – 7-ой. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №52 | Апартамент №710 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1580. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №53 | Апартамент №711 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1575. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №54 | Апартамент №801 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1574. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №55 | Апартамент №802 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1600. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №56 | Апартамент №803 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1591. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №57 | Апартамент №809 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1590. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №58 | Апартамент №810 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1610. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №59 | Апартамент №811 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1611. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №60 | Апартамент №901 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1612. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №61 | Апартамент №902 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1638. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №64 | Апартамент №907 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1641. Назначение – нежилое. Этаж – 9, 10. Площадь – 347,2 кв. м | 55 370 084,00 | 5 537 008,40 |
| Лот №65 | Апартамент №908 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1648. Назначение – нежилое. Этаж – 9, 10. Площадь – 351,0 кв. м | 51 643 526,00 | 5 164 352,60 |
| Лот №66 | Апартамент №1001 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1659. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 347,7 кв. м | 51 158 074,00 | 5 115 807,40 |
| Лот №67 | Апартамент №1002 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1651. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 344,0 кв. м | 50 614 082,00 | 5 061 408,20 |
| Лот №68 | Апартамент №1003 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1663. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №69 | Апартамент №1004 (2-комнатный 2-уровневый) с кадастровым номером 23:49:0203004:1671. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 139,0 кв. м | 21 983 837,00 | 2 198 383,70 |
| Лот №70 | Апартамент №1009 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1670. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №71 | Апартамент №1010 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1672. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №72 | Апартамент №1011 (4-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1646. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 247,4 кв. м | 36 400 333,00 | 3 640 033,30 |
| Лот №73 | Апартамент №1101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1647. Назначение – нежилое. Этаж – 11. Площадь – 108,3 кв. м | 17 127 889,00 | 1 712 788,90 |
| Лот №74 | Гаражный бокс №1 с кадастровым номером 23:49:0203004:1649. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 14,9 кв. м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот №75 | Гаражный бокс №2 с кадастровым номером 23:49:0203004:1673. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 14,5 кв. м | 1 342 132,00 | 134 213,20 |
| Лот №76 | Гаражный бокс №3 с кадастровым номером 23:49:0203004:1618. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 14,0 кв. м | 1 337 849,00 | 133 784,90 |
| Лот №77 | Гаражный бокс №4 с кадастровым номером 23:49:0203004:1650. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,7 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №78 | Гаражный бокс №5 с кадастровым номером 23:49:0203004:1652. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 13,9 кв. м | 1 337 849,00 | 133 784,90 |
| Лот №79 | Гаражный бокс №6 с кадастровым номером 23:49:0203004:1654. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,7 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №80 | Гаражный бокс №7 с кадастровым номером 23:49:0203004:1596. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 13,2 кв. м | 1 332 137,00 | 133 213,70 |
| Лот №81 | Гаражный бокс №8 с кадастровым номером 23:49:0203004:1601. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,8 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №84 | Гаражный бокс №11 с кадастровым номером 23:49:0203004:1607. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 13,4 кв. м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот №85 | Гаражный бокс №12 с кадастровым номером 23:49:0203004:1598. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 11,3 кв. м | 1 316 432,00 | 131 643,20 |
| Лот №86 | Гаражный бокс №13 с кадастровым номером 23:49:0203004:1604. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 14,9 кв. м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот №87 | Гаражный бокс №14 с кадастровым номером 23:49:0203004:1605. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,5 кв. м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот №88 | Гаражный бокс №15 с кадастровым номером 23:49:0203004:1608. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,5 кв. м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот №89 | Гаражный бокс №16 с кадастровым номером 23:49:0203004:1606. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 13,1 кв. м | 1 330 710,00 | 133 071,00 |
| Лот №90 | Гаражный бокс №17 с кадастровым номером 23:49:0203004:1614. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 11,7 кв. м | 1 319 287,00 | 131 928,70 |
| Лот №91 | Гаражный бокс №18 с кадастровым номером 23:49:0203004:1609. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,5 кв. м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот №92 | Гаражный бокс №19 с кадастровым номером 23:49:0203004:1617. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,1 кв. м | 1 322 143,00 | 132 214,30 |
| Лот №93 | Гаражный бокс №20 с кадастровым номером 23:49:0203004:1562. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,0 кв. м | 1 329 282,00 | 132 928,20 |
| Лот №94 | Гаражный бокс №21 с кадастровым номером 23:49:0203004:1561. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,5 кв. м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот №95 | Гаражный бокс №22 с кадастровым номером 23:49:0203004:1563. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,0 кв. м | 1 329 282,00 | 132 928,20 |
| Лот №96 | Гаражный бокс №23 с кадастровым номером 23:49:0203004:1653. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 14,3 кв. м | 1 340 704,00 | 134 070,40 |
| Лот №97 | Гаражный бокс №24 с кадастровым номером 23:49:0203004:1676. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 15,9 кв. м | 1 353 554,00 | 135 355,40 |
| Лот №98 | Гаражный бокс №25 с кадастровым номером 23:49:0203004:1655. Назначение – нежилое Этаж – подвал №3. Площадь – 12,4 кв. м | 1 324 998,00 | 132 499,80 |
| Лот №99 | Гаражный бокс №26 с кадастровым номером 23:49:0203004:1656. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,8 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №102 | Гаражный бокс №29 с кадастровым номером 23:49:0203004:1679. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,7 кв. м | 1 334 993,00 | 133 499,30 |
| Лот №104 | Гаражный бокс №31 с кадастровым номером 23:49:0203004:1681. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,0 кв. м | 1 329 282,00 | 132 928,20 |
| Лот №105 | Гаражный бокс №32 с кадастровым номером 23:49:0203004:1675. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,5 кв. м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот №106 | Гаражный бокс №43 с кадастровым номером 23:49:0203004:1667. Назначение – нежилое. Цокольный этаж №2. Площадь – 11,7 кв. м | 1 359 266,00 | 135 926,60 |

ОПИСАНИЕ АПАРТОТЕЛЯ

Апартаменты и гаражные боксы находятся в здании апартотеля, представляющего собой монолитное 13-этажное здание (введено в эксплуатацию в апреле 2015 г.), расположенного по адресу: г. Сочи, ул. Политехническая, д. 62, в одном из самых экологически чистых районов, на круглосуточно охраняемой территории Государственного учреждения «Санаторий «Беларусь» в непосредственной близости от государственной дачи «Бочаров ручей». Апартотель расположен на земельном участке с кадастровым №23:49:0203004:21, площадью 155 600 кв. м, предоставленном Государственному учреждению «Санаторий «Беларусь» на праве аренды по 22.09.2062. Разрешенное использование земельного участка – для размещения и эксплуатации зданий и сооружений санатория

УСЛОВИЯ

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по 23.06.2017 г. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.
Валюта торгов – российский рубль. Валюта платежа – российский рубль.
Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях. Сумма для оплаты задатка на участие в аукционе для резидентов Республики Беларусь производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Объекта (Объектов) с Продавцом в течение 5 (пяти) дней с назначенной даты аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты аукциона.
Передача Победителю аукциона (Претенденту на покупку) пакета документов для регистрации (оформления) права собственности осуществляется только после оплаты полной стоимости Объекта (Объектов).
Государственная регистрация договора купли-продажи Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после полной оплаты стоимости, приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) и получения перечисленной суммы Продавцом.
Все расходы по удостоверению, составлению и оформлению договора купли-продажи, уплате государственной пошлины оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Запрет на изменение фасадной части.
Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 5% от стоимости Объекта (Объектов)

**Аукцион состоится 29.06.2017г. в 10.00 по мск по адресу: Российская Федерация, Краснодарский край, г. Сочи, ул. Политехническая, 62, конгресс-зал главного корпуса. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.
Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях 3012232138035, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов (Лот №__), проводимом 29 июня 2017 г.
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Российской Федерации.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются:
- в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений 23.06.2017 до 12.00 по белорусскому времени.
- в г. Сочи, ул. Политехническая, 62, конгресс-зал в здании главного корпуса 28.06.2017г. с 10.00 до 13.00 по мск. Для этого потенциальному участнику необходимо не позднее 23.06.2017г. по средствам электронной почты и (или) факсимильной связи обратиться к Организатору аукциона с заявлением с просьбой о проведении процедуры регистрации в качестве участника аукциона в г. Сочи и представить копию платежного документа о перечислении задатка.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Кришеник Сергей Иванович, тел.: 8-10-7-862-259-60-02, 8-10-7-862-259-60-12, 8-10-7-928-451-31-69.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**